www.gazeta.bsu.by

БДУ

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

27 красавіка 2006 года, № 9 (1939)

АКТУАЛЬНА

## ШЧЫРЫ ДЫЯЛОГ ПРА ЧАРНОБЫЛЬ

***24 красавіка ў актавай зале ліцэя БДУ прайшоў дыялог-семінар, прысвечаны Чарнобыльскай трагедыі. Яго ўдзельнікамі сталі больш за 400 студэнтаў з усіх факультэтаў БДУ.***



У семінары прынялі ўдзел рэктар БДУ Васіль Стражаў, прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзімір Сувораў. Перад студэнтамі выступілі дырэктар Інстытута ядзерных праблем БДУ, заслужаны дзеяч навукі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, вядомы навукоўца, прафесар Уладзімір Барышэўскі і намесніца начальніка сацыяльна-прававога аддзела Дзяржаўнага камітэта па праблемах наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Наталля Кахноўская. Яны распавялі пра падзеі красавіка 1986 г. і пра тое, што за 20 гадоў было зроблена па ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай катастрофы, а таксама пра далейшае ажыццяўленне дзяржаўных праграм па мінімізацыі наступстваў трагедыі. Семінар прайшоў у форме прэс-канферэнцыі: студэнты мелі магчымасць задаць свае пытанні выступоўцам.



Падобнае мерапрыемства ўжо адбылося 18 красавіка ў ліцэі БДУ для выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Да 20-годдзя Чарнобыльскай катастрофы на некаторых факультэтах нашага універсітэта Фундаментальная бібліятэка БДУ арганізавала шэраг кніжных выстаў: "Трагедыя беларускага народа", "Хто вінаваты і што рабіць? Дзень Чарнобыльскай трагедыі", "Чарнобыль — наш боль і памяць". Адбыліся таксама і сустрэчы з пісьменнікамі. Так, 21 красавіка на геаграфічным факультэце прайшла сустрэча з Анатолем Зэкавым і прэзентацыя яго кнігі "Чарнобыльскі вецер".

**Сняжана ЛІСОЎСКАЯ**
**Фота Аляксандра СНАПКА**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

## ШУКАЕМ НАЙЛЕПШУЮ ГАЗЕТУ

***У БДУ абвешчаны конкурс на лепшую малатыражную студэнцкую газету БДУ, прысвечаную Году маці.***

Арыгінал-макеты конкурсных нумароў малатыражных студэнцкіх газет (максімальны аб'ём — 8 старонак фармату А4) трэба падаваць ва ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю (галоўны корпус, пакой 207) да 24 мая.

Ацэньвацца будуць нагляднасць, ілюстрацыйнасць, стылёвае адзінства, паўната раскрыцця тэмы, інфармацыйнасць і змястоўнасць выкарыстаных матэрыялаў, перыядычнасць выхаду малатыражнага выдання і афармленне выпускных звестак газеты. Вынікі конкурсу будуць апублікаваныя ў газеце "Універсітэт". Пераможцаў чакаюць каштоўныя прызы.

Жадаем творчых поспехаў!

СЕМІНАРЫ

## СТУДЭНЦКАЕ САМАКІРАВАННЕ

Семінар "Студэнцкае самакіраванне: вопыт работы і перспектывы міжвузаўскага ўзаемадзеяння" прайшоў 25 красавіка ў канферэнц-зале інтэрната №2. Удзел у ім узялі студэнты і кіраўніцтва БДУ, МДЛУ, БДПУ, БДЭУ і БНТУ.

На семінары працавалі секцыі "Органы студэнцкага самакіравання: структура, праблемы, перспектывы развіцця", "Падтрымка маладзёжных ініцыятываў у рамках дзейнасці органаў студэнцкага самакіравання ў ВНУ-ўдзельніцах семінара" і "Студэнцкія сродкі масавай інфармацыі".

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## ПАСЯБРУЕМ З ЧЖЭЦЗЯН

***Перспектывы супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і навукі, а таксама стварэнне сумесных навукова-вытворчых структур былі абмеркаваны 21 красавіка падчас першага візіту ў наш універсітэт дэлегацыі кітайскай правінцыі Чжэцзян на чале з намеснікам старшыні Народнага ўрада гэтай правінцыі Мао ЛІНГШЭНГАМ з першым прарэктарам БДУ Сяргеем РАХМАНАВЫМ і прарэктарам па вучэбнай рабоце Уладзімірам КЛЮНЕМ.***



У склад дэлегацыі ўваходзілі таксама кіраўнікі Дэпартамента па навуцы і тэхналогіях і генеральныя дырэктары навукова-тэхнічных аб'яднанняў правінцыі Чжэцзян.

Кітайскіх гасцей асабліва зацікавіла магчымасць стварэння сумеснага прадпрыемства па вытворчасці вырабаў з пенапаліурэтану, у першую чаргу сарбентаў для збору нафтапрадуктаў у выпадку экалагічных здарэнняў, па тэхналогіях, распрацаваных навукоўцамі БДУ.

У выніку сустрэчы была дасягнута дамоўленасць пра падпісанне рамачнага пагаднення аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве паміж Дэпартаментам навукі і тэхналогіі Народнага ўрада правінцыі Чжэцзян і БДУ. Гаворка ішла таксама пра арганізацыю выставы навукова-тэхнічнай прадукцыі Белдзяржуніверсітэта ў Кітаі.

Таксама абмяркоўвалася магчымасць падрыхтоўкі ў нашым універсітэце кітайскіх спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі.

Кітайская дэлегацыя высока ацаніла стан навукі і адукацыі ў БДУ. Першы прарэктар БДУ Сяргей Рахманаў і намеснік старшыні ўрада правінцыі Чжэцзян Мао Лінгшэнг выказалі ўпэўненасць у далейшым развіцці добрых двухбаковых адносінаў.

**Юлія ПАПОВА**
**Фота аўтара**

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

### БДУ — ТЭРЫТОРЫЯ ЗДАРОЎЯ

**Развіццё фізічнай культуры і спорту ў БДУ**

Стар. 2

### "У БДУ ПРАЙШЛО ЎСЁ НАША ЖЫЦЦЁ..."

**Нарыс пра былога рэктара БДУ Усевалада Міхайлавіча СІКОРСКАГА**

Стар. 3

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

Дэлегацыя выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ з 21 красавіка па 3 мая знаёміцца з арганізацыяй навучальнага працэсу ва універсітэце іспанскага горада Малага. Візіт адбываецца ў рамках праекта TEMPUS.

Пашыранае пасяджэнне рэктарата адбылося 24 красавіка на геаграфічным факультэце. Прысвечана яно было такой тэме, як "Кафедра — асноўны ланцужок па фарміраванні інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя навучальнага працэсу". З дакладамі выступілі дэкан факультэта Іван Піроржнік і некаторыя загадчыкі кафедраў.

У гэты ж дзень рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў сустрэўся з новаабраным студэнцкім актывам Белдзяржуніверсітэта. Гаворка ішла пра ўдасканальванне навучальнага працэсу, перспектывы развіцця універсітэта.

Незвычайнае здарэнне адбылося 24 красавіка ў БДУ. У выніку ананімнага тэлефоннага паведамлення пра мініраванне галоўнага корпуса універсітэта на гадзіну была спынена нармальная праца супрацоўнікаў і студэнтаў. Супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях даволі хутка правялі аператыўныя мерапрыемствы: высветлілася, што інфармацыя была няпраўдзівай. Аператыўна быў знойдзены і той, хто тэлефанаваў пра мініраванне. Тэлефонны злачынца, дарэчы, не з'яўляецца ні студэнтам, ні супрацоўнікам БДУ.

Пятага мая ва універсітэце адбудзецца ўшанаванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Гэта ўрачыстае мерапрыемства прысвячаецца 9 Мая — Дню Перамогі.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# БДУ – ТЭРЫТОРЫЯ ЗДАРОЎЯ

**На IX Рэспубліканскай выставе навукова-метадычнай літаратуры і педагагічнага вопыту “Развіццё фізічнай культуры і спорту, фарміраванне здаровага ладу жыцця навучэнцаў і студэнтаў”, якая прайшла ў Беларусі ў сярэдзіне красавіка і ў якой прынялі ўдзел 39 ВНУ з усёй краіны, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь узнагародзіла Беларускі дзяржаўны універсітэт двума дыпломамі першай ступені: за развіццё фізічнай культуры і спорту, а таксама за фарміраванне здаровага ладу жыцця студэнтаў.**

***Цяпер у БДУ вялікая ўвага надаецца самастойнай рабоце студэнтаў. Будучы спецыяліст павінен не толькі авалодваць прафесійнымі ведамі і навыкамі, але і дбаць пра сваё здароўе. Арганізаваць навучальны працэс так, каб студэнт не забываўся на фізічныя практыкаванні і ўмацаванне свайго здароўя, — клопат агульнауніверсітэцкай кафедры фізічнага выхавання і спорту. Пра гэта распавядае прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзімір Васільевіч СУВОРАЎ:***

— На маю думку, кафедра фізвыхавання і спорту павінна адыгрываць вельмі значную ролю ў рэфармаванні адукацыйнага працэсу ў нашым універсітэце. У большасці студэнты БДУ імкнуцца быць здаровымі і прывабнымі. І трэба падтрымліваць іх жаданне развівацца фізічна і ствараць для гэтага ўсе неабходныя ўмовы. У цэлым, задача развіцця формаў кантраляванай самастойнай работы студэнтаў на кафедры фізвыхавання і спорту стаіць, мабыць, больш востра, чым у любым іншым навучальным падраздзяленні. Асабліва калі ўлічыць спецыфіку заняткаў фізкультурай і тое, што студэнты могуць выкарыстоўваць не толькі тую матэрыяльную базу, якая ёсць у БДУ, але і агульнадаступныя каткі, стадыёны, трэнажорныя залы і г.д.

Дыпломы, якія атрымаў БДУ на выставе, не кажуць пра тое, што ў нас усё цудоўна. Хаця зразумела, што ў нашым універсітэце робяцца значныя намаганні, каб дасягнуць заўважных вынікаў у фізвыхаванні і спорце. Нашыя спартыўныя пляцоўкі не пустуюць. Недарма на рэспубліканскіх спартакіядах БДУ ўжо шмат гадоў займае прызавыя месцы. Развіваецца і матэрыяльная база. Найбольш значнай падзеяй у гэтым плане будзе адкрыццё сёлета 1 верасня спартыўнага комплексу на вул. Кастрычніцкай пасля рамонту. Рэктар В. Стражаў таксама прыняў рашэнне пабудаваць у 2007 г. надзіманае спартыўнае збудаванне ў раёне філіяла БДУ ў Шчамысліцы (падобнае збудаванне можна ўбачыць на скрыжаванні вул. Голубева і прасп. Дзяржынскага каля медуніверсітэта).

Разам з тым, на маю думку, варта зазначыць, што ніводная ВНУ не падышла да вырашэння праблемы арганізацыі кантраляванай самастойнай работы студэнтаў па фізвыхаванні так глыбока і комплексна, як гэта робіцца ў БДУ. Распрацаваныя ў нас методыкі і трэнажоры кантролю функцыянальнага стану навучэнца дазваляюць ставіць пытанне пра прынцыпова новую ацэнку вынікаў заняткаў фізкультурай: асноўная ўвага звяртаецца менавіта на функцыянальны стан арганізма студэнта.

Пазнаёміўшыся з напрацоўкамі кафедры фізвыхавання і спорту нашага універсітэта, міністр адукацыі А. Радзькоў сваім загадам даручыў вывучыць магчымасць стварэння на базе БДУ міжвузаўскага цэнтра па пытаннях дыягностыкі, функцыянальнага стану, фізічнага здароўя і фізічнага развіцця навучэнцаў і студэнтаў.

Сапраўды, у БДУ надаецца вялікая ўвага развіццю фізічнай культуры і спорту, а таксама фарміраванню здаровага ладу жыцця студэнтаў. Не абыходзіцца, вядома, і без праблемаў. Але спалучэнне інтэлектуальнага падыходу ў арганізацыі навучальнага працэсу, спартыўнага майстэрства і досведу педагогаў — аснова, якая дае надзею на абавязковае вырашэнне няпростых задачаў, якія стаяць перад кафедрай.



*У спорткомплексе па вул. Кастрычніцкай будуць плавальны басейн, зала вольнай і грэка-рымскай барацьбы, зала барацьбы дзюдо, гульнявая зала, спецыяльна абсталяваная зала для заняткаў цяжкай атлетыкай і гіравым спортам, зала ЛФК, зала з сучаснымі трэнажорамі.*

Фота Юліі ПАПОВАЙ

***Загадчык кафедры фізвыхавання і спорту, доктар педагагічных навук, прафесар, заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь Віктар Антонавіч КАЛЯДА:***

**— Якія задачы стаяць сёння перад кафедрай фізічнага выхавання і спорту БДУ?**

— Першачарговая задача кафедры — павышэнне ролі фізічнай культуры і спорту ў межах адукацыйнай праграмы БДУ. Нашы мэты канкрэтныя: умацаванне здароўя студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта, паступовае развіццё іх спартыўных магчымасцяў, забеспячэнне ўмоваў для рэалізацыі іх патэнцыялу ў сферы спорту.

Трэба сказаць, што наша кафедра дзейнічае адразу ў трох напрамках: педагагічным, спартыўна-масавым і навуковым. Педагагічны напрамак дзейнасці кафедры — гэта правядзенне сістэматычных практычных заняткаў са студэнтамі I—IV курсаў з дыферэнцыраваным фарміраваннем навучальных груп у залежнасці ад узроўню фізічнай падрыхтоўкі і стану здароўя студэнтаў. Спартыўна-масавую работу ажыццяўляе спартыўны клуб, які ўваходзіць у структуру кафедры. Яго дзейнасць прадугледжвае магчымасць фізічнага ўдасканалення для ўсіх жадаючых па-за межамі навучальнага працэсу.

Навуковы напрамак прадстаўлены дзейнасцю дзвюх незалежных лабараторый, у складзе якіх працуюць высокакваліфікаваныя спецыялісты.

**— А якія навуковыя распрацоўкі кафедры ўжо выкарыстоўваюцца ў БДУ?**

— У апошнія гады стала відавочным, што надышоў час рэфармавання сістэмы фізічнага выхавання студэнтаў, пераходу на новыя, больш змястоўныя тэхналогіі кантролю за здароўем і фізічным станам студэнтаў у рамках навучальнага працэсу. Для гэтага ў БДУ пачалі выкарыстоўвацца розныя методыкі вызначэння ступені фізічнай падрыхтаванасці студэнтаў і стану іх здароўя, распрацаваныя пад кіраўніцтвам кандыдата тэхнічных навук В.І. Ярмалінскага. Гэтыя методыкі дапамагаюць індывідуалізаваць фізічныя нагрузкі для кожнага студэнта. Найперш гэта датычыцца спецыяльных медыцынскіх групаў. У БДУ сёння каля 3000 студэнтаў, якія па стане свайго здароўя вымушаны займацца ў спецгрупах. Такія групы патрабуюць асаблівай увагі з боку выкладчыкаў, індывідуальнага падыходу да кожнага студэнта і стварэння адэкватнай праграмы фізічнага выхавання.

Добра паказала сябе і методыка экспрэс-тэставання, распрацаваная ў нашым універсітэце: яна цяпер актыўна выкарыстоўваецца не толькі ў БДУ, але і ў нацыянальных зборных камандах Беларусі, і ў вядучых лекава-прафілактычных установах нашай краіны. Гэтую методыку ў БДУ пачынаў распрацоўваць кандыдат тэхнічных навук Б.М. Шпілявы. Згодна з гэтай методыкай, адсочваюцца параметры сардэчна-сасудзістай сістэмы, даецца экспрэс-дыягностыка, якая дазваляе атрымліваць аператыўную інфармацыю пра функцыянальны стан арганізма.

Распрацоўка сучасных методык для вызначэння фізічных нагрузак набывае сапраўдную актуальнасць у сувязі са значным пагаршэннем стану здароўя і фізічнай падрыхтаванасці паступаючых у ВНУ. Таму асаблівай увагі патрабуюць менавіта першакурснікі.

**— Хто праводзіць даследаванні стану здароўя студэнтаў і ступені іх фізічнай падрыхтаванасці?**

— На жаль, практыка медыцынскіх аглядаў у студэнцкіх паліклініках сёння не адпавядае патрабаванням нацыянальнай сістэмы адукацыі. Узаемадзеянне і ўзаемапаразуменне паміж адукацыйнай і медыцынскай галінамі пакуль таксама няма. Стандартнае медыцынскае заключэнне пра стан здароўя студэнта не адлюстроўвае сапраўднай карціны і патрабуе сур’ёзнага дадатковага аналізу, якім і займаецца наша кафедра.

**— Якія спартыўныя секцыі найбольш папулярныя сярод студэнтаў нашага універсітэта?**

— У БДУ працуюць каля 24 розных секцый, або груп спартыўнага ўдасканальвання. З імі займаюцца вядучыя выкладчыкі і трэнеры. На нашай кафедры сёння працуе 9 заслужаных трэнераў, большасць з іх рыхтуе зборныя каманды універсітэта. Найбольш папулярнымі ў студэнтаў БДУ лічацца гульнявыя віды спорту: баскетбол, валейбол, футбол, лёгкая атлетыка, плаванне, — а таксама ўсходнія адзінаборствы (асабліва дзюдо і каратэ). Не застаюцца без увагі і такія віды спорту, як армрэстлінг, турызм, альпінізм, спартыўнае арыентаванне. Колькасць студэнтаў, якія займаюцца ў гэтых групах, у апошнія гады значна ўзрасла. Студэнты займаюцца з задавальненнем, а таму і дасягаюць значных поспехаў.

У спартыўныя групы студэнты прыходзяць па асабістым жаданні. На жаль, у некаторыя з іх доступ пакуль абмежаваны, бо ў нас ёсць пэўныя цяжкасці з матэрыяльнай базай. Гэта ў першую чаргу датычыць плавання і спартыўнага арыентавання. Але калі пачне працаваць новы спартыўны комплекс, гэтыя секцыі з задавальненнем прымуць усіх жадаючых.

**— Як, на вашу думку, зрабіць фізкультуру прывабнай для студэнтаў?**

— Самае галоўнае — стварыць добрую матэрыяльную базу. Наведваць добра абсталяваныя спартыўныя комплексы, трэнажорныя і фітнес-залы, басейны, безумоўна, прыемна і прэстыжна. Тут нават не патрэбна ніякай дадатковай матывацыі.

Але я ўпэўнены, што для студэнта, які сам імкнецца да фізічнай актыўнасці, у нашым універсітэце ўжо ёсць усе ўмовы, каб з першых дзён студэнцкага жыцця мэтанакіравана развіваць фізічныя здольнасці.

Праводзяцца агульнауніверсітэцкія спартакіяды, спартыўныя святы і іншыя фізкультурныя мерапрыемствы сярод супрацоўнікаў і студэнтаў, якія выяўляюць лепшых сярод тых, хто імкнецца да фізічнага ўдасканалення.

Трэба памятаць, што фізкультура — гэта не толькі спартыўнае выхаванне, але і выхаванне фізічнай культуры асобы, яе ўдалая сацыялізацыя, павышэнне матывацыі да здаровага ладу жыцця. У першую чаргу мы рыхтуем не спартсменаў, а здаровую, гарманічную, усебакова развітую асобу.

**Сняжана ЛІСОЎСКАЯ**
**Фота Дзмітрыя СНАПКА**



*Плануецца, што ў надзіманым спартыўным збудаванні (прыблізныя памеры: 100х25 м) будуць гульнявыя пляцоўкі, якія можна абсталяваць пад розныя віды спартыўных гульняў (баскетбол, валейбол, тэніс і інш.). Таксама там будуць бегавыя дарожкі. Прадугледжваюцца і часовыя трыбуны для гледачоў.*

**Кафедра фізічнага выхавання і спорту была створана ў 1948 г.**

**Асноўныя віды яе дзейнасці звязаны з арганізацыяй навучальнага працэсу, навукова-даследчай, спартыўна-масавай і выхаваўчай работай са студэнтамі.**

**У структуры кафедры функцыянуюць спартыўны клуб, метадычны савет, навукова-даследчая лабараторыя, грамадскія арганізацыі. Тут працуюць 103 супрацоўнікі, сярод якіх 90 штатных выкладчыкаў (10 маюць навуковыя ступені і званні: 2 прафесары і 8 дацэнтаў), 9 заслужаных трэнераў Рэспублікі Беларусь, а таксама 6 навуковых супрацоўнікаў.**

**Каля 40 студэнтаў-спартсменаў БДУ ўваходзяць у зборныя каманды сярод дарослых і моладзі – найперш па традыцыйных для ВНУ відах спорту: грэка-рымскай і вольнай барацьбе, лёгкай атлетыцы, дзюдо, плаванні, спартыўнай аэробіцы, спартыўным арыентаванні, баскетболе і валейболе, шахматах і шашках, армрэстлінгу, гіравым, лыжным і веласіпедным спорце.**

**Студэнты БДУ ў складзе зборных нацыянальных камандаў неаднаразова станавіліся пераможцамі і прызёрамі найбуйнейшых міжнародных спаборніцтваў, Алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету, Еўропы, сусветных універсіяд.**

**Усе студэнты, якія хочуць займацца ў групах спартыўнага ўдасканальвання, а таксама ўдзельнічаць у спартыўна-масавых мерапрыемствах універсітэта, могуць звяртацца ў спартыўны клуб БДУ (галоўны корпус, кабінет 436 а, тэл. 209-54-85, дырэктар Вольга Валянцінаўна Амялюсік), а таксама да адказных за спартыўнае выхаванне на факультэтах.**

## СТУДГАРАДОК СПАРТЫЎНЫ

Спартыўныя мерапрыемствы студэнцкага гарадка рэалізуюцца ў рамках базавай праграмы “Фарміраванне здаровага ладу жыцця ў студэнтаў”.

На тэрыторыі, прылеглай да інтэрнатаў № 3 і № 10, функцыянуюць 2 спартыўныя пляцоўкі, прыстасаваныя для гульні ў баскетбол і міні-футбол.

У інтэрнатах дзейнічаюць спартыўныя секцыі аздараўляльнай аэробікі (№ 7), каратэ (№ 10) і брэйк-дансу (№ 1 і 10).

Праводзяцца наступныя мерапрыемствы:

— Спартакіяда студэнцкага гарадка. Яна праходзіць у 2 туры па 9 відах спорту: баскетбол, міні-футбол, валейбол, настольны тэніс, шахматы, спартыўнае арыентаванне, перацягванне каната, плаванне, більярд;

— упершыню сёлета адбыліся спаборніцтвы на “Кубак дырэкцыі студгарадка БДУ”, якія праходзяць двойчы ў год па 7 відах спорту: баскетбол, міні-футбол, перацягванне каната, валейбол, настольны тэніс, більярд, боўлінг. У восеньскіх спаборніцтвах перамагла зборная студэнтаў. Вясновыя гульні на “Кубак дырэкцыі” заканчваюцца, падвядзенне вынікаў адбудзецца на выязным семінары-практыкуме “Школа студэнцкага актыву”;

— штогод ладзіцца Кубак студгарадка па міні-футболе;

— адбываюцца выязныя семінары-практыкумы “Школа актыву”, дзе праходзяць спартландыі паміж студэнтамі і супрацоўнікамі БДУ, спаборніцтвы па баскетболе, валейболе, настольным тэнісе;

— на працягу апошніх 2 гадоў каманда студгарадка БДУ прымае ўдзел у ваенна-спартыўным свяце “Сіла, мужнасць, адвага” на базе ваеннай часці 5448.

**Калі вы хочаце стаць удзельнікам нашых спартыўных мерапрыемстваў, звяртайцеся на адрас: вул. Кастрычніцкая, 4, каб. 104, тэл. 209-52-99, альбо да прадстаўнікоў спартыўных камісій студсаветаў інтэрнатаў.**

УНІВЕРСІТЭТ

БДУ 85

АСОБЫ

# "У БДУ ПРАЙШЛО ЎСЁ НАША ЖЫЦЦЁ..."

***У гэты юбілейны для роднага ўніверсітэта год мы неаднаразова будзем звяртацца да старонак яго гісторыі. Сёння мы гартаем фотаальбом сям'і Сікорскіх.***

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА

Усевалад Міхайлавіч Сікорскі займаў пасаду рэктара з 9 кастрычніка 1972 па 14 чэрвеня 1978 г., доўгі час быў загадчыкам кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў БДУ.

**Званні:** член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі, доктар філасофскіх навук, прафесар, Заслужаны дзеяч навукі Беларусі.

**Узнагароды:** 2 ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга і ордэн Айчыннай вайны 1-й ступені, медалі "За адвагу", "За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне", "За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне".

Аўтар больш чым 200 друкаваных прац. Падчас рэктарства спрыяў супрацоўніцтву БДУ з замежнымі ўніверсітэтамі, асабліва з Сафійскім універсітэтам Балгарыі (у тыя часы іх нават называлі ўніверсітэтамі-пабрацімамі), а таксама з Іенскім універсітэтам (Германія). Усевалад Міхайлавіч нават атрымаў медаль за плённы ўклад у развіццё дружбы і супрацоўніцтва гэтых ВНУ. За гады рэктарскай дзейнасці Сікорскага істотна пашырыліся вучэбныя, лабараторныя і іншыя плошчы ўніверсітэта, палепшылася матэрыяльна-тэхнічная база.

## ХАЧУ БЫЦЬ АКАДЭМІКАМ!

Бацька Сікорскага — Міхаіл Іванавіч — у 30-х гг. быў дырэктарам Хутарской школы Чэрвеньскага раёна. Дзякуючы яму школа атрымала новы будынак, стала ўзорнай, атрымала другую прэмію рэспубліканскага конкурсу. Але ў 1937 г. пасля паклёпніцкага даносу дырэктара арыштавалі, рэпрэсавалі і саслалі на 10 год у лагер у Архангельскай вобласці. Маці звольнілі з працы (яна настаўнічала ў школе), ёй давялося зарабляць на жыццё шытвом. Грошай у сям'і не хапала. Аднойчы маленькі Усевалад спытаў:

— Хто больш за ўсіх зарабляе?

— Ну, пэўна ж, акадэмікі! — адказала яму маці.

— Тады я хачу быць акадэмікам, каб наша сям'я жыла заможна!

Жарты жартамі, а стаў Усевалад акадэмікам...

## У ГАДЫ ВАЙНЫ

Усевалад Міхайлавіч і два яго браты вучыліся ў той самай Хутарской школе, пакуль не пачалася вайна. Юнакоў збіралі для адпраўкі ў Германію. Усевалад і яшчэ некалькі хлопцаў, рызыкуючы жыццём, уцяклі, а пасля падаліся да народных мсціўцаў. Сікорскі быў у партызанскім атрадзе да самага вызвалення. Пасля перамогі яго накіравалі працаваць у Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.



## СЫНАВЫ ЎСПАМІНЫ

Расказвае сын — **Валерый Усеваладавіч** — дацэнт, кандыдат фізіка-матэматычных навук:

— У таты былі сур'ёзныя праблемы са здароўем (цяжкая хвароба сэрца). У маіх дзіцячых успамінах бацька ўвесь час ляжыць на ложку. Там ён і дысертацыю пісаў. На абарону кандыдацкай сябры аднеслі яго на руках. Шмат складанасцей сустрэлася на яго шляху. Дысертацыю адразу не зацвердзілі. Але ён не здаўся — наадварот, гэта прымусіла бацьку працаваць яшчэ больш. Ён быў вельмі моцны духам, валявы. У 53-м годзе ўрачы сказалі, што ён больш не будзе жыць. Толькі дзякуючы нязломнай сіле волі ён змагаўся за жыццё і пражыў пасля такога прысуду дактароў ажно 28 год.

**— Якія дасягненні Усевалада Міхайлавіча як рэктара?**

— Самае важнае — што пад кіраўніцтвам бацькі было запланавана будаўніцтва новага ўніверсітэцкага гарадка. Саўмін СССР зацвердзіў план будаўніцтва 15 вучэбных і навуковых карпусоў. Але ж многія кіраўнікі разумеюць, што будаўніцтва — самы цяжкі фронт, і проста не бяруцца за гэта. У 80-х гадах ад гэтага плану адмовіліся.

**— Як Усевалад Міхайлавіч бавіў вольны час?**

— Большасць часу бацька праводзіў за кнігамі. У лепшыя дні (калі адчуваў сябе нядрэнна) вельмі любіў парыбачыць, схадзіць у грыбы, пагуляць па лесе, адпачыць на прыродзе. Калі ў 64-м абараніў доктарскую дысертацыю, ён адчуў сябе чалавекам, які выканаў праграму-мінімум і можа дазволіць сабе крыху адпачыць.

**— Якім чынам жыццё вашай сям'і звязана з БДУ?**

— Мой сын, як і я, скончыў фізфак, — кажа Валерый Усеваладавіч. — Сястра — біяфак, абараніла кандыдацкую дысертацыю па радыяцыйнай хіміі, засталася працаваць ва ўніверсітэце. Сёння яна жыве ў Маскве і працуе дырэктарам Дома рускай касметыкі, з'яўляецца аўтарам шматлікіх кніг па касметалогіі. Маці доўгі час выкладала англійскую мову ў фізікаў.

***

Сустрэліся мы і з удавой былога рэктара Сікорскага — **Надзеяй Паўлаўнай**, якая 37 год выкладала англійскую мову ў БДУ. Гэта жанчына вельмі плённа працавала на фізфаку. Складзеныя ёю падручнікі выходзілі тыражамі 100—130 тысяч экземпляраў. Па іх і сёння вучацца студэнты-фізікі (!). Дэкан фізічнага факультэта Віктар Міхайлавіч Анішчык, колішні студэнт Надзеі Паўлаўны, вельмі ўдзячны ёй, кажа, што без яе не скончыў бы аспірантуру: яна займалася з ім дадаткова. Надзея Паўлаўна выкладае англійскую мову і зараз... у праўнука-трэцякласніка!

— Пазнаёміліся мы з Усеваладам Міхайлавічам у 47-м на навагодняй вечарыне ў інстытуце фізкультуры, — успамінае Н.П. Сікорская. — Ажаніліся ў 49-м. У гады вайны я працавала на чыгунцы слесарам па рамонце вагонаў. Жылі ў бараку, які амаль не ацяпляўся. Аднойчы, памятаю, раніцою не магу адарваць галаву ад падушкі: косы прымерзлі! З Усеваладам Міхайлавічам мы таксама пэўны час жылі ў адным з баракаў для выкладчыкаў і аспірантаў ва ўнутраным дворыку БДУ. Там у нас нарадзіўся сын.

— Калі Усевалад Міхайлавіч працаваў у карэспандэнцкім пункце "Праўды", — працягвае Надзея Паўлаўна, — яго прызначылі ў камандзіроўку за мяжу. Сталі афармляць дакументы, і высветлілася, што яго бацька некалі быў аб'яўлены ворагам народа. Усевалада адразу звольнілі. Пасля гэтага ён стаў супрацоўнічаць са "Звяздой", пакуль не паступіў у аспірантуру на кафедры гісторыі філасофіі.

Журналісцкая жылка Усевалада Міхайлавіча праявілася і пазней, падчас працы ў БДУ: разам з Рубцовым і Мастковым яны выдавалі газету, якая цяпер выходзіць пад назвай "Універсітэт".

## ПАМЯЦЬ

— Маці падтрымлівае адносіны з супрацоўнікамі Хутарской школы, — кажа Валерый Усеваладавіч. — Уся наша сям'я вельмі ўдзячна ім за тое, што яны робяць. Чым больш сталею, тым больш разумею, што ледзьве не самы важны прадмет — гісторыя. Менавіта яна дазваляе ведаць, што разумнага і добрага зрабілі нашы папярэднікі, вызваляе нас ад неабходнасці другі раз вынаходзіць веласіпед, засцерагае ад таго, каб двойчы наступаць на тыя ж граблі...

Мноства матэрыялаў, звязаных з Усеваладам Міхайлавічам Сікорскім, Надзея Паўлаўна перадала для музея гісторыі БДУ: ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалі. Усе яны і сёння захоўваюцца ў сейфе, чакаюць адкрыцця музея. Некаторыя дакументы ёсць у Нацыянальным архіве.



Ёсць музей, які ўшаноўвае памяць Сікорскага, і ў Хутарской школе. Створаны ён членамі краязнаўчага гуртка "Спадчына". Тут сабраны фотаздымкі, навуковыя працы братоў Мікалая і Усевалада. Запісаны ўспаміны старажылаў. Юныя краязнаўцы афармілі радаводнае дрэва Сікорскіх, якое ахоплівае ажно 6 пакаленняў дынастыі. А перад школай пасаджаны 3 дубкі ў гонар братоў Сікорскіх.

З ліста Пятра Сакава, настаўніка Хутарской школы, кіраўніка краязнаўчага музея, — Надзеі Паўлаўне: "Пройдуць гады, мы, прадстаўнікі старэйшага пакалення, пойдзем з жыцця, а ўнукі і праўнукі будуць прыходзіць да гэтых памятных дрэўцаў".

**Ала МАЧАЛАВА**

## АБ'ЯВЫ

### РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: метадаў аптымальнага кіравання, тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі, матэматычнага забеспячэння ЭВМ, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцяў;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: кібернетыкі, ураўненняў матэматычнай фізікі, высокамалекулярных злучэнняў, фізічнай хіміі, беларускай літаратуры і культуры;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі, вышэйшай матэматыкі, тэарэтычнай і прыкладной механікі, ураўненняў матэматычнай фізікі, дыферэнцыяльных ураўненняў, радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, дынамічнай геалогіі, менеджменту, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі, эканамічнай тэорыі, замежнай літаратуры, гісторыі беларускай мовы, класічнай філалогіі, сучаснай беларускай мовы, міжнародных эканамічных адносін, агульнай і клінічнай псіхалогіі, псіхафізіялогіі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: кібернетыкі, агульнага землязнаўства, фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі, беларускай літаратуры і культуры, класічнай філалогіі, прыкладной лінгвістыкі, раманскага мовазнаўства, сучаснай беларускай мовы, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, філасофіі і метадалогіі навукі, міжнародных эканамічных адносін, дызайну, агульнай і клінічнай псіхалогіі, агульнанавуковых дысцыплін, псіхафізіялогіі, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, нямецкай мовы;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі, менеджменту, эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі, эканамічнай тэорыі, класічнай філалогіі, нямецкага мовазнаўства, прыкладной лінгвістыкі, рускай мовы, тэорыі літаратуры, міжнародных эканамічных адносін, дызайну, нямецкай мовы, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі, тэхналогіі праграміравання, тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі, лікавых метадаў і праграміравання, тэорыі функцый, функцыянальнага аналізу.

**Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г.Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

### ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады:**

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ кіравання фінансамі і нерухомасцю;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: кіравання фінансамі і нерухомасцю, дзяржаўнага права.

**Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 210-01-10.**

### НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА "ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н. СЕЎЧАНКІ" БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 01.04.04 (фізічная электроніка) — 2 чалавекі;

навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 01.04.07 (фізіка кандэнсаванага стану) — 1 чалавек.

**Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Дакументы накіроўваць на адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл. 212-48-43.**

ВІНШУЕМ!

## ЮБІЛЕЙ БІЗНЕС-АДУКАЦЫІ Ў БДУ

Мерапрыемствы, прымеркаваныя да 10-годдзя Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій, адбыліся 19—21 красавіка: V Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Актуальныя праблемы бізнес-адукацыі", Першы бізнес-форум "Бізнес-адукацыя і беларуская эканоміка: сістэма, якая вядзе да поспеху". У іх працы прынялі ўдзел выкладчыкі БДЭУ, БНТУ, Магілёўскага і Брэсцкага тэхнічных універсітэтаў, Гомельскага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі і Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, а таксама госці з Расіі, ЗША, Швецыі, Нарвегіі, Грэцыі.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**




"Знания, которые работают" — пад такой назвай выйшаў артыкул у газеце **"Белорусы и рынок"** (24.04.06), прысвечаны 10-годдзю Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ.

**"Настаўніцкая газета"** (22.04.06) у матэрыяле "Работнікаў шукаюць адразу ва ўніверсітэце" расказала пра першую сустрэчу выпускнікоў Белдзяржуніверсітэта з патэнцыяльнымі працадаўцамі, якую арганізавала "Кадравае агенцтва БДУ".

Пра першы афіцыйны візіт у БДУ дэлегацыі кітайскай правінцыі Чжэцзян на чале з намеснікам Народнага ўрада гэтай правінцыі Мао Ліншэнгам паведамілі газеты **"Рэспубліка"** (21.04.06) і **"Вечерний Минск"**.

**"Рэспубліка"** ў нумары за 19.04.06, а таксама газета **"Строительство и недвижимость"** (11.04.06), **"Вечерний Минск"** (13.04.06) паведамілі пра ўдзел БДУ ў міжнароднай гандлёвай выставе "Rebuild Iraq — 2006", якая праходзіла 3—6 красавіка ў сталіцы Іарданіі горадзе Аман і прысвячалася аднаўленню Ірака.

Артыкул "Служение" ў **"Советской Белоруссии"** (14.04.06) прысвечаны першаму прарэктару Інстытута тэалогіі БДУ айцу Серафіму. У гэтым жа нумары газеты змешчана гутарка з прафесарам кафедры міжнародных адносін БДУ Анатолем Розанавым "Бархатный занавес вместо железного", прысвечаная 60-годдзю фултанскай прамовы Уінстана Чэрчыля.

**"Знамя юности"** (14.04.06) у артыкуле "Самая обаятельная и привлекательная" знаёміць з пераможцай конкурсу БДУ "Міс Вясна-2006" Людмілай Палавінка.

Пра гэтыя і іншыя падзеі ў БДУ паведамлялі ў сваіх матэрыялах інфармацыйныя агенцтвы БЕЛТА, БелаПАН, ІНТЭРФАКС, АТН, тэлеканалы ЛАД, БТ, СТБ, АНТ, Беларускае радыё і FM-станцыі.

**Агляд падрыхтаваны прэс-службай БДУ**

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

*В.М. Анищик, Л.Б. Елисеева, Н.И. Поляк, В.В. Ходасевич.* **Задачи и упражнения по дифракционному анализу.** Дапаможнік для студэнтаў фізічнага факультэта БДУ складаецца з 7 раздзелаў. У кнізе даюцца сціслыя звесткі з тэорыі і ўмовы задач па крышталяграфіі, фізіцы рэнтгенаўскіх промняў, рассеяння рэнтгенаўскіх промняў, асноўных метадах рэнтгенаструктурнага аналізу, электранаграфіі і электроннай мікраскапіі. Разглядаюцца рашэнні некаторых задач і даюцца неабходныя для рашэння дадаткі.

**Всё начинается с клетки. Готовимся изучать биологию.** Навучальны дапаможнік для замежных слухачоў факультэта даўніверсітэцкай адукацыі БДУ рыхтуе іх да вывучэння курса біялагічных дысцыплін на рускай мове, прывучае да мовы вучэбна-прафесійных зносін.

*А.П. Ждановский.* **Введение в постклассическую философию.** Вучэбна-метадычны комплекс змяшчае праграму курса, канспект лекцый і практыкум па філасофіі.

**Философия. Культура. Общество.** У зборнік увайшлі тэзісы дакладаў і выступаў студэнтаў і аспірантаў БДУ на навуковай канферэнцыі, праведзенай на базе факультэта філасофіі і сацыяльных навук. У матэрыялах аналізуюцца актуальныя праблемы сацыякультурнай дынамікі на сучасным этапе, разглядаюцца сацыяльна-псіхалагічныя фактары чалавечага існавання, інтэрпрэтуюцца фундаментальныя стратэгіі развіцця філасофскіх і навуковых ведаў.

*В.М. Борздов, Г.М. Новик, А.Н. Сетун.* **Элементарная база электроники.** Лабараторны практыкум змяшчае апісанне лабараторных работ: тэарэтычная частка, разліковае і лабараторнае заданні, метадычныя ўказанні па выкананні работ, а таксама кантрольныя пытанні.

**Програмы агульных курсаў: Для студэнтаў гістарычнага факультэта.** У 3 частках. Частка 3. Выданне змяшчае базавыя эксперыментальныя праграмы агульных курсаў для студэнтаў БДУ, якія навучаюцца па спецыяльнасці "Гісторыя".

**Человек. Культура. Общество.** У зборнік увайшлі тэзісы дакладаў I Міжнароднай навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў "Чалавек. Культура. Грамадства" (Мінск, 21—22 мая 2004 г.), якая праводзілася факультэтам філасофіі і сацыяльных навук БДУ.

**Теория и методы исследования коммуникаций.** Выпуск 1. Зборнік навуковых работ прысвячаецца актуальным праблемам тэорыі і практыкі камунікацыі, а таксама метадам камунікацыйных даследаванняў.

**Диалог культур и перспективы социокультурной глобализации в современном обществе.** У артыкулах, якія ўвайшлі ў зборнік, раскрываюцца асноўныя тэндэнцыі працэсу глабалізацыі сучаснага грамадства на аснове дыялогу культур, механізмы ўзаемадзеяння і ўзаемаўзбагачэння нацыянальных традыцый, шляхі развіцця асобаснай культуры ў кантэксце выкладання філасофска-культуралагічных дысцыплін у БДУ.

*Г.А. Медведев.* **Стохастические процессы финансовой математики.** Манаграфія падае вынікі даследаванняў, якія датычаць матэматычных мадэляў вызначэння рынкавых цэн фінансавых актываў і фінансавых вытворных на аснове ўласцівасцяў стахастычных працэсаў, якія характарызуюць змену працэнтных ставак даходнасці на фінансавым рынку.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы**

АКЦЫІ

# НЕ ШКАДУЙЦЕ ЧАСУ НА СЯБРОЎСТВА

Пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў і Беларускае маладзёжнае грамадскае аб'яднанне "Розныя-Роўныя" 18 красавіка арганізавалі незвычайную акцыю "Я знаходжу надзею". Актавая зала галоўнага корпуса БДУ стала пляцоўкай, дзе студэнты 5 гадзін запар спрабавалі перададолець межы, што падзяляюць людзей. Зразумець чужы клопат і боль дапамагалі розныя методыкі: замест звычайнага аповеду пра сябе падчас знаёмства студэнты малявалі на ватмане па тры сімвалы, што адлюстроўваюць іх асобу, а інтэрпрэтавалі гэтыя сімвалы іх новыя сябры. Згуртаваць маладых людзей у адзіную групу дазволіў метад арт-тэрапіі: кожны з прысутных атрымаў музычны інструмент, граць пачыналі адначасова, чым больш паразумення было між удзельнікамі імправізаванага аркестра, тым больш зладжана ён гучаў. Не менш цікавымі былі і іншыя часткі сустрэчы — ад гульняў да выніковай дыскусіі, дзе абмяркоўваліся стэрэатыпы і забабоны, што існуюць у нашым грамадстве, асуджалася дыскрымінацыя.

БМГА "Розныя-Роўныя" — гэта каля 200 чалавек, якія стараюцца зрабіць свет аднолькава добрым для ўсіх, наладзіць дыялог грамадства і чалавека з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, перадолець негатыўныя стэрэатыпы. За час існавання арганізацыі (з 1999 г.) рэалізавана шмат сацыяльных і культурна-адукацыйных праграм: псіхалагічныя трэнінгі, экалагічныя акцыі, міжнародныя маладзёжныя абмены, інтэграцыйныя вечарыны і дыскатэкі, канцэрты маладых беларускіх музыкаў, фотавыставы.

Студэнты, якія прынялі ўдзел у акцыі, не шкадуюць затрачанага часу: яны навучыліся лепей разумець сябе і іншых, пабагацелі на новых сяброў.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# АГЛЕДЗІНЫ ЛІТАРАТУРЫ

Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Руская і беларуская літаратуры на мяжы XX—XXI стагоддзяў" адбылася 25 красавіка на філалагічным факультэце. У яе працы ўзялі ўдзел літаратуразнаўцы з буйных навуковых цэнтраў Расіі, Украіны, Польшчы. На пленарным пасяджэнні прагучалі 14 дакладаў навукоўцаў з Кіева, Масквы, Цверы, Санкт-Пецярбурга, Чалябінска. Падчас працы 7 секцый удзельнікі абмеркавалі новыя тэндэнцыі ў сучаснай рускай і беларускай прозе і паэзіі, пытанні сучаснай драматургіі, праблематыку сучаснай літаратуры.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

# ЖУРФАК У КАНТЭКСЦЕ

20 красавіка на факультэце журналістыкі адбылася 63-я навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў, у ёй прынялі ўдзел 163 студэнты, 10 аспірантаў. На канферэнцыі працавалі секцыі "Тэорыя і метадалогія журналістыкі", "Сацыялогія журналістыкі", "Палітычная журналістыка і паліталогія журналістыкі", "Перыядычны друк", "Літаратурна-мастацкая крытыка", "Міжнародная журналістыка", "Гісторыя журналістыкі і літаратуры", "Праблемы сучаснай камунікацыі", "Стылістыка і літаратурнае рэдагаванне", "Тэле- і радыёжурналістыка", "Журналісцкі дыскурс/Journalistic Discourse".

Як падкрэсліла намеснік дэкана В.М. Самусевіч, у час дынамічнага развіцця інфармацыйнага рынку краіны становіцца надзвычай актуальным даследаванне прынцыпаў развіцця нацыянальных і сусветных СМІ ў новым сацыякультурным кантэксце. Шырыня ахопу навуковых праблем і пытанняў, якія цікавяць маладых навукоўцаў — студэнтаў і аспірантаў, — паказвае, што канферэнцыя на належным навуковым узроўні працягвае навуковыя традыцыі факультэта.

**Таццяна МЕЛЬНІК**

# КІНЬ ЦЫГАРЭТУ — АТРЫМАЕШ ЦУКЕРКУ!

Дзень барацьбы з курэннем прайшоў 18 красавіка на юрыдычным факультэце. У корпусе былі развешаны плакаты пра шкоду курэння, па факультэцкім радыё гучалі заклікі кінуць курыць. Тым, хто выказваў згоду развітацца са шкоднай звычкай, узамен цыгарэтаў прапаноўвалі цукеркі.

З ініцыятывай такой акцыі выступілі студэнты юрфака, акцыя адбываецца ўжо чацвёрты раз. Нагадаем, што Сусветны дзень барацьбы з курэннем адзначаецца 31 мая.

**Паводле інфармацыі прэс-службы**

З УСМЕШКАЙ

***

— Прафесар, у мяне будзе аўтамат?
— Так, і кірзавыя боты!!!

***

Бацька дасылае сыну тэлеграму: "Як прайшоў іспыт? Адказвай тэрмінова".

Сын — у адказ: "Іспыт прайшоў бліскуча, прафесары ў захапленні. Просяць паўтарыць увосень".

***

— Скажыце, якая ў вас методыка напісання дыплома?
— Ctrl+C, Ctrl+V!

ГОСЦІ

# КНІГІ — У ПАДАРУНАК



20 красавіка ў чытальнай зале прыродазнаўчых навук Фундаментальнай бібліятэкі БДУ адбылася ўрачыстая цырымонія перадачы ў дарунак кніг пра Казахстан, перададзеных пасольствам Казахстана ў фонд бібліятэкі. Сярод падораных кніг — мастацкая і навуковая літаратура казахстанскіх аўтараў, фотаальбомы пра прыроду Казахстана, альбом рэпрадукцый народнага мастака Казахстана Абылхана Касцеева і інш. На цырымоніі прысутнічала жонка Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Казахстана ў Рэспубліцы Беларусь Маншук Алдамжарава. Супрацоўнікам бібліятэкі было цікава даведацца пра культуру і звычаі казахскага народа.

Госця з сонечнага Казахстана выявілася цікавай суразмоўцай і зрабіла самае прыемнае ўражанне на прысутных.

**Паводле інфармацыі ФБ БДУ**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# СТАРАДАЎНЯЯ МУЗЫКА Ў БДУ



*Тэатр старадаўняй музыкі Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта 15 сакавіка даў у ліцэі БДУ спектакль.*

Дзеянне на сцэне было арганізавана ў форме шахматнай партыі паміж двума выдатнымі музычнымі творамі англійскіх кампазітараў XVIII стагоддзя — "Каралева фей" Генры Пёрсэла і "Опера жабракоў" Джона Гея. Урыўкі з опер перамяжаліся тэкстам, напісаным самімі выканаўцамі. Студэнты і выкладчыкі з Вараб'ёвых Гор парадавалі мінскіх калег высокай якасцю выканання харавых і сольных партый, цудоўна гучаў аркестр, узначалены заснавальнікам і кіраўніком тэатра Валерыем Крайсбергам. Гісторыя англійскай музыкі, пададзеная ў захапляльнай форме, не пакінула гледачоў абыякавымі.

Заснаваны ў 1980 г., Тэатр старадаўняй музыкі МДУ аб'ядноўвае сёння каля 30 артыстаў-спевакоў і 15—20 аркестрантаў, усе маюць музычную адукацыю. Вялікі поспех мелі выступленні калектыву, лаўрэата маскоўскага фестывалю "Фестас" (праводзіцца сярод музычных тэатраў), на сцэнах гарадоў Расіі, а таксама ў Хельсінках, Празе, Вільнюсе, Таліне. І ў Мінску — дадамо цяпер мы.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**
**Фота аўтара**

# ПРЭМ'ЕРА "КАЛАСОЎ" У ЛІЦЭІ



*Тэатральная студыя ліцэя БДУ "Пакуль жыву..." 20 красавіка паказала музычна-драматычную сцэну па матывах рамана Ул. Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім".*

Галоўным рэжысёрам пастаноўкі выступіла выкладчыца беларускай літаратуры Лера Мікітаўна Рубашная. Паводле яе словаў, задума зрабіць такі спектакль прыйшла ёй нечакана ("падказала душа Караткевіча").

Чаму ж быў абраны менавіта гэты твор? Па-першае, летась споўнілася 75 гадоў з дня нараджэння пісьменніка. Па-другое, гэта адзін з самых папулярных твораў у ліцэйскай праграме. Па-трэцяе, раман адпавядае спецыфіцы настаўніцкага калектыву ліцэя БДУ: многія акцёры атрымалі ролі, адпаведныя іх характарам. У выніку стварылася студыя выкладчыкаў, навучэнцаў, выпускнікоў і супрацоўнікаў ліцэя: у спектаклі былі заняты 74 акцёры.

Падрыхтоўка да такога маштабнага відовішча вялася з вясны 2004 г. У сакавіку 2005 г. пастаноўку ў скарочаным варыянце пабачылі ліцэйскія гледачы. А поўнамаштабная прэм'ера адбылася 20 красавіка сёлета. Гледачы былі ў захапленні. Зала, перапоўненая пачуццём падзякі, доўга не адпускала артыстаў: гучалі працяглыя апладысменты.

**Кацярына АДАМОВІЧ,**
**выпускніца Ліцэя**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

27 красавіка 2006 года
Падпісана да друку 26.04.2006 г.
Зак. 406. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праcп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by